# Новы музей у Верхнім горадзе



Добры падарунак атрымалі аматары музычнай культуры Беларусі. Днямі ў Мінску па Музычнаму завулку, 5 у былым «доме масонаў», пасля рэстаўрацыі гасцінна адчыніў дзверы філіял Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры краіны.

Аснову першай экспазіцыі склала унікальная выстаўка гармонікаў музыкі і самадзейнага кампазітара Міхаіла Іванавіча Слізкага. У ёй больш як трыццаць інструментаў. Беларускія, рускія, аўстрыйскія гармонікі адрозніваюцца рознай танальнасцю гучання, вабяць вока аздабленнем і з'яўляюцца дзеючымі экспанатамі. У гэтым змаглі пераканацца першыя наведвальнікі музея, якіх сустракаў жаночы ансамбль гарманістаў Беларускага універсітэта культуры.

Выстаўка гармонікаў у старажытным кутку сталіцы працягнецца да восені. Як зазначыў намеснік міністра культуры В. Гедройц, з цягам часу на месцы часовых выставак у гэтым філіяле музея з'явіцца пастаянная экспазіцыя.

Віктар ХУРСІК.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.







НА ЗДЫМКАХ: самадзейны кампазітар **М. І. Слізкі**; у залах музея экспануецца серыя малюнкаў на тэму музыкі; тут размясціўся музей.